ВОКНЫ З ВІДАМ НА ГМАХ

Мінск працягвае ўшчыльняцца. Гараджане пратэстуюць...

СТАЛІЧНАЯ грамадскасць усё часцей выступае супраць ушчыльнення забудовы. То тут, то там рэгулярна ўспыхваюць скандалы. Месцам разладу стаў і мікрараён Уручча-2, жыхары якога пратэстуюць супраць будаўніцтва двух шматпавярховікаў дамоў на зялёнай тэрыторыі ў межах вуліц Русіянава і Шугаева. З гэтай нагоды ініцыятыўная група жыхароў звярнулася з лістом у рэдакцыю «Звязды».

Жыхары Уручча-2: «Асвойвайце новыя землі!»

У маі інтэрнэт абляцеў ролік, на якім жыхары Уручча-2 змагаюцца за свой сквер з дужымі хлопцамі ў спартыўнай форме. Як распавядаюць відавочцы, 2 мая а 6 гадзіне раніцы да сквера на скрыжаванні вуліц Русіянава і Шугаева пад'ехаў аўтобус з байцамі спецназа, у якіх былі рыдлёўкі і сякеры (у адміністрацыі раёна і «Зелянбудзе» сцвярджаюць, што спецназа там не было). Хлопцы рушылі на ўчастак выкарчоўваць дрэвы, змятаючы на сваім шляху ўсіх, хто выйшаў абараніць сквер. Супрацоўнікі міліцыі назіралі за тым, што адбываецца, ні ў што не ўмешваючыся...

— На месцы гэтага сквера яшчэ ў 1999 годзе меркавалася пабудаваць 2 пяціпавярховыя дамы з мансардныя паверхамі, — распавядае **мясцовы жыхар, намеснік старшыні ЖБК-494 Леанід МАЖАЛЬСКІ.** — Але людзі сталі пратэставаць. У выніку перапісак і сустрэч з тагачасным мэрам М. Паўлавым забудова была адменена. Нам дазволілі добраўпарадкаваць гэты куток, і мы ўжо шмат гадоў дамагаемся, каб скверу надалі імя генерала Івана Русіянава.

У 2005 годзе на гэты ўчастак зямлі зноў «паклалі вока», і жыхары зноў сталі збіраць подпісы супраць ушчыльнення. А ў 2009 годзе з'явілася рашэнне пабудаваць тут два 12-павярховыя дамы па 72 кватэры кожны — для супрацоўнікаў палка міліцыі спецыяльнага прызначэння. І вось цяпер гэтае рашэнне стала ўвасабляцца ў жыццё.

Улады сцвярджаюць, што ўсё па законе і нарматывы дазваляюць гэта зрабіць. Жыхары мікрараёна лічаць, што ўлады падганяюць нарматывы ў свой бок і што будаўніцтва дамоў ва Уруччы можна лічыць недапушчальным ушчыльненнем.

— Чырвоная мяжа Уручча — Русіянава абмяжоўвае ўчастак 45 га, — сцвярджае Леанід Мажальскі. — Але ўлады «пашырылі» межы нашага мікрараёна, неабгрунтавана ўключыўшы ў яго склад ландшафтна-рэкрэацыйную зону «88 ЛР-2», захапіўшы пры гэтым тэрыторыю Парка высокіх тэхналогій і МКАД. У выніку гэтага агульная плошча мікрараёна «павялічылася» да 121 га, г.зн. практычна ў 3 разы. Калі зыходзіць з гэтых лічбаў, то з азеляненнем у нас усё нармальна і надта высокага ўшчыльнення няма. Але калі браць рэальныя межы нашага мікрараёна, то атрымліваецца 4,8 м² азелянення на чалавека. А па нарматывах павінна быць 9-10 м². Шчыльнасць жыхароў ва Уруччы-2 складае 766 чалавек на гектар, а павінна быць (згодна з Генпланам)195-245 чал./га.

— У нас на ўсё Уручча — адна паліклініка. Ужо цяпер трэба выстаяць паўдня ў чарзе, каб трапіць на прыём да ўрача, — абураюцца людзі. — Дзіцячая паліклініка перапоўнена. Як будзе з медыцынскім абслугоўваннем? Таксама ёсць праблемы з паркоўкай аўтамабіляў, дзецям няма дзе гуляць...

— Ніхто не задумваецца, што нагрузка на камунікацыі значна павялічыцца, — працягвае аргументаваць сваю пазіцыю Леанід Мажальскі. — Тутэйшым калектарам ужо 27 гадоў. Усё разваліцца, і хто потым за гэта будзе адказваць? Безумоўна, пры пасадцы будынка на гатовыя камунікацыі эканоміцца 30-40% ад каштарысу. Але ж камунікацыі разлічаны на пэўную колькасць дамоў і ўжо не спраўляюцца.

Пытанняў у жыхароў назапасілася шмат.

— У нас у доме 25 пад'ездаў, 983 кватэры, 3 тысячы жыхароў. Мяне як намесніка старшыні ЖБК хвалюе тое, што нашы дамы застаюцца без капітальнага рамонту, — працягвае спадар Мажальскі. — Цяпер капрамонты ідуць за кошт нашых паступленняў. Мы падлічылі, што робім штогод адлічэнняў на 100 тысяч долараў. За 10 гадоў гэта будзе 1 млн долараў. І гэта ўсё цяпер ідзе ў агульны кацёл. А праз 10-15 гадоў мы застанемся каля разбітага карыта. Новыя забудоўшчыкі пераходзяць на самаабслугоўванне і акумулююць грошы на капрамонт у сябе на рахунках. Сёння робяцца капрамонты старога жылога фонду, потым гэтыя дамы таксама пяройдуць у таварыствы ўласнікаў і будуць на самаабслугоўванні. Крыніцамі паступлення сродкаў на капрамонт яны ўжо не стануць. А што будзе з нашым домам, калі настане час для яго капітальнага рамонту? Хто думае аб перспектывах? Як мы будзем жыць далей? Атрымліваецца, план адзін: ушчыльніць нас — і пакінуць са сваімі праблемамі.

— Мы не адмаўляем будаўніцтва наогул, — з надрывам кажа **Уладзімір ТАРАСАЎ, адзін з жыхароў мікрараёна.** — Гаворка ідзе аб ушчыльненні, якога быць не павінна. Асвойвайце новыя землі! Тут быў сад, усё цвіло! Мы самі стваралі гэты зялёны куток, саджалі дэкаратыўнае кустоўе і кветкі, а цяпер усё гэта хочуць у нас адабраць. Тут паўстае і маральнае пытанне: пабудаваць дом і стаць суседзямі пакрыўджаных імі ж жыхароў... Як можна ставіцца да гэтага? Гэта ж цынізм...

Абурае тое, што да іх на працягу апошніх 7 гадоў ніхто не прыслухоўваецца, наракаюць людзі. І выносяць вердыкт: нікому з чыноўнікаў да нас няма справы.

Гарадскія ўлады: «Калі рашэнне прымае чыноўнік, ён загадзя будзе вінаваты»

— Гэты мікрараён будаваўся ў 90-я гады, калі нормы шчыльнасці былі 6800-7200 м²/га, — растлумачыў «Звяздзе» **дырэктар прадпрыемства «Мінскграда» Леанід ДОБЫШ.** — Сёння па рэгламенце шчыльнасць складае для высакашчыльнай забудовы — 6001-7600 м²/га, для сярэднешчыльнай — 3800-6000 м²/га, для нізкашчыльнай — менш за 3800 м²/га.

Ва ўмовах рэканструкцыі забудовы, якая ўжо склалася, нарматыў можна павялічваць на 15%. У выніку, калі 7600 павялічыць на 15%, атрымліваецца 8740 м²/га.

Ва Уручы шчыльнасць жылога фонду сёння роўная 6838 м²/га. Згодна з Праектам дэталёвай планіроўкі, мяркуецца павялічыць яе да 7134 м²/га. Так што, як бачыце, да верхніх межаў нормы яшчэ далёка.

Што тычыцца азелянення, то ў дэталёвым плане пралічваецца яго працэнт. Пры гэтым улічваюцца і паказчыкі зялёнай зоны агульнага карыстання ў радыусе 500-метровай пешаходнай даступнасці — нават калі гэта не супадае з межамі раёна. Сёння ва Уручы гэты паказчык — адзін з лепшых у Мінску. Гэты мікрараён з трох бакоў акружаны ландшафтнай зонай, і ў чыста працэнтных суадносінах усе нарматывы па азеляненні захаваны з лішкам. Але якасць азелянення я б назваў нізкай. Дрэнна ідуць справы з унутрыдваровым азеляненнем: дваровыя тэрыторыі ўяўляюць сабой у асноўным газоны. Такое ўражанне, што жыхарам гэта не трэба. Таму працаваць трэба над рэальным азеляненнем дваровых тэрыторый. Мэр горада ўжо даў нам такое даручэнне.

❑ ❑ ❑

Старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва, галоўны архітэктар Мінска Аляксандр ПЯТРОЎ скандалы, што ўспыхваюць у Мінску з нагоды ўшчыльнення, лічыць сведчаннем развітасці дэмакратыі. Сёння гэтыя пытанні выносяцца на абмеркаванне, людзі выказваюць свае думкі — адсюль адчуванне, што такіх выпадкаў стала больш. Але стала больш не выпадкаў, а абмеркаванняў, упэўнены ён.

— Усе людзі, і я ў тым ліку, маюць пэўны ўнутраны эгаізм, — сцвярджае Аляксандр Пятроў. — Мне хочацца, каб мяне ні ў чым не ўшчамлялі. І калі я прывык жыць і бачыць перад сабой зялёную прастору, я ўжо падсвядома пачынаю лічыць, што гэта мая тэрыторыя. Хоць на самой справе яна мне не належыць — гэта тэрыторыя гарадская, і горад можа распарадзіцца ёю па-свойму. Але, паколькі я прывык лічыць яе сваёй, натуральна, калі ў горада з'явяцца на яе планы, у мяне ўзнікне пратэст...

— Горад наш сёння вельмі шчыльна забудаваны, — працягвае галоўны архітэктар сталіцы. — Але ў тым жа Уручы сёння шчыльнасць ніжэйшая за максімальна дапушчальную. Будаўніцтва дадатковых пяці дамоў (згодна з Генпланам развіцця Мінска) можа перавысіць нарматывы па шчыльнасці, але выключэнне з плана аднаго дома прывядзе да адпаведнасці нарматывам. Гэта значыць, чатыры дамы там можна спакойна размяшчаць. Але канкрэтна наконт гэтых дамоў я нічога не магу сказаць. Рашэнне аб іх пабудове будзе прынятае пасля дадатковага разгляду гэтага пытання.

Галоўны архітэктар Мінска нагадаў, што ў свой час пры забудове мікрараёнаў у Мінску заставаліся пустыя месцы. Гэта было выклікана тым, што раней існавала абмежаванне па будаўніцтве вышынных будынкаў (вышэй за 9 паверхаў). У савецкія гады былі вялікія праблемы з ліфтамі, а на будынкі звыш 9 паверхаў на адзін пад'езд па нарматывах патрабуецца два ліфты. І там, дзе планаваліся больш высокія дамы, іх не будавалі. «Прайшло 20 гадоў, і сёння ўсе ўжо забыліся пра тое, што там былі запраектаваны дамы, — сказаў А. Пятроў. — Цяпер жыхары пачынаюць абурацца: нам і так дыхаць няма чым, зеляніны не хапае... З людзьмі ў гэтым плане цяжка размаўляць. Хоць сёння экалагічная абстаноўка ў Мінску лепшая, чым у абласных цэнтрах. Мы самі былі здзіўлены, калі параўналі паказчыкі»....

Законам сёння прадугледжана грамадскае абмеркаванне перспектывы забудовы Мінска. Атрымліваць станоўчае рашэнне большасці жыхароў пры гэтым неабавязкова. Па пратаколе можа быць нават так, што ўсе жыхары супраць будаўніцтва. Але аб'ект будзе будавацца — і гэта не стане парушэннем закона. Па сутнасці, калі маецца факт правядзення грамадскага абмеркавання — гэтага дастаткова.

Зразумець забудоўшчыкаў няцяжка: добра, калі не трэба цягнуць інжынерныя камунікацыі, а можна танна «пасадзіць» новы дом на ўжо існуючыя сеткі. Калі ж пачынаць будаўніцтва ў чыстым полі, квадратны метр будзе каштаваць у некалькі разоў даражэй. Але забудоўшчыкаў, як правіла, не хвалюе тое, што павялічваецца нагрузка на састарэлыя інжынерныя сеткі. Бо пасля засялення новых дамоў думаць пра праблемы з цяплом, водазабеспячэннем і каналізацыяй давядзецца тым, хто ўсімі сіламі спрабаваў абараніць гэтую тэрыторыю ад ушчыльнення.

Вядома, калі заўсёды слухаць жыхароў, ёсць шанц наогул нічога не пабудаваць. З другога боку, не лічыцца з меркаваннем людзей таксама няправільна. Патрэбен канструктыўны дыялог, чаго часцяком няма. Жыхары, якіх пытанні ўшчыльнення датычацца асабіста, часта скрупулёзна ўнікаюць ва ўсе дэталі і добра бачаць магчымыя праблемы і ўскладненні. Наўрад ці варта адмахвацца ад гэтага, інакш узмацненне супрацьстаяння і рост напружанасці забяспечаны.

P.S.: ***На днях у скверы на стыку вуліц Шугаева і Русіянава мясцовыя жыхары ўсталявалі памятны знак у гонар Героя Савецкага Саюза генерал-лейтэнанта Івана Русіянава і байцоў 100-й гвардзейскай дывізіі. Яны не ўтойваюць, што зрабілі гэта ў тым ліку і для абароны зялёнай зоны ад замахаў.***

P.P.S. ***У бліжэйшым нумары газеты чытайце працяг тэмы — артыкул «МІНСК — ГОРАД З САМАЙ ШЧЫЛЬНАЙ ЗАБУДОВАЙ СЯРОД ЕЎРАПЕЙСКІХ ГАРАДОЎ-МІЛЬЁННІКАЎ».***

Святлана БУСЬКО.

Невядомыя выкарчоўваюць дрэвы на «месцы разладу».

ДАВЕДКА З АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА

З **3128 зваротаў**, якія паступілі за 5 месяцаў гэтага года ад жыхароў Мінска, **420** тычыцца пытанняў будаўніцтва. З іх 210 звязана з пытаннямі калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, 11 — індывідуальнага, 125 зваротаў закранае пытанні крэдытаў і субсідый на жыллёвае будаўніцтва... **Што ж тычыцца пытання ўшчыльнення забуды, то ад мінчан за акрэслены перыяд паступіла 17 зваротаў, большасць з Першамайскага і Цэнтральнага раёнаў.**

Надзея ДРЫЛА.

ЯК РАЗЛІЧВАЕЦЦА ШЧЫЛЬНАСЦЬ ЖЫЛОЙ ТЭРЫТОРЫІ

Мы запыталіся ў галоўнага архітэктара «Мінскграда» Аляксандра АКЕНЦЬЕВА, якія горадабудаўнічыя параметры ўлічваюцца пры вызначэнні шчыльнасці жылой тэрыторыі.

— Неспецыялісту цяжка ў гэтым разабрацца, — лічыць Аляксандр Рыгоравіч. — Для разліку шчыльнасці жылой тэрыторыі трэба зыходзіць з усяго комплексу неабходных аб'ектаў для жыццезабеспячэння сям'і, якія ўключае ў сябе мікрараён. У гэты комплекс уваходзяць жылыя дамы, аб'екты сацыяльнага абслугоўвання (школа, дзіцячы сад, малочная кухня, крама з таварамі штодзённага попыту і г.д.), гаражы і аўтамабільныя стаянкі, зоны адпачынку. Прычым пры ўшчыльненні ў разліковую тэрыторыю ўключаюцца аб'екты мікрараённага значэння, якія плануецца пабудаваць.

Выходзіць, тэрыторыя для разліку шчыльнасці забудовы і дэталёвы план развіцця — не адно і тое ж. Нагадаем, дэталёвы план развіцця Уручча-2 распрацаваны спецыялістамі ў межах пр. Незалежнасці — Русіянава — заходняя мяжа ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны 228 ЛР4 — паўднёвая мяжа ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны 88 ЛР2-МКАД. Сам мікрараён знаходзіцца як бы ўсярэдзіне гэтага плана — як адзін з яго элементаў.

Тут збіраюцца пабудаваць два 12-павярховыя дамы.

— Патрэбен арбітр, — лічыць Аляксандр Пятроў. — Павінен з'явіцца яшчэ адзін бок, які б разводзіў канфліктуючых, улічваў усе аргументы і мог прыняць незалежнае рашэнне. Цяпер адміністрацыя раёна не ў стане гэтага зрабіць. Калі рашэнне прымае чыноўнік, ён загадзя будзе вінаваты. Прыме бок забудоўшчыка — значыць, той яго падкупіў. Прыме бок жыхароў — забудоўшчык абвінаваціць чыноўніка ў тым, што ён перашкаджае прыцягненню ў Мінск інвестыцый. Таму працэдуру трэба ўдасканальваць. Можа, варта стварыць нейкую грамадскую раду. У Маскве ёсць такая практыка: спрэчная сітуацыя выносіцца на абмеркаванне грамадскай рады, якая з'яўляецца нейтральным бокам.

Замест заключэння

Забудоўшчыку трэба пабудаваць аб'ект. Жыхары раёна лічаць, што будоўля ўшчамляе іх інтарэсы і хочуць абараніць свае правы. У наяўнасці — сутыкненне інтарэсаў. І, як правіла, чым больш яно цягнецца, тым гарачэй палаюць страсці. Памірыць людзей, супраць волі якіх спрабуюць узводзіць розныя аб'екты, і чыноўнікаў, якім трэба вырашаць пытанні будаўніцтва новага жылля і інвестыцый, таксама вельмі складана.

ПІСЬМЕННІЦА З БАРЫСАВА — СЯРОД ПРЭТЭНДЭНТАЎ НА ПРЭСТЫЖНУЮ РАСІЙСКУЮ ПРЭМІЮ

Беларускі празаік Алена Брава, аўтар пакуль што адзінай кнігі «Каменданцкі час для ластавак», у апошні час становіцца вядомай і чытачам Расіі. Яе празаічныя творы размешчаны ў інтэрнэт-прасторы на рускай мове. Аповесць «Дараванне» надрукавана ў часопісе «Сибирские огни». Іншыя творы прыняты да разгляду часопісамі «Новый мир» і «Дружба народов». Пісьменніца адзначана расійскім літаратурным медалём імя Канстанціна Сіманава. Апошняя навіна — Алена Брава за аповесць «Дараванне», прысвечаную Другой сусветнай вайне, намініравана на расійскую літаратурную прэмію «Ясная Поляна». Пакуль што твор беларускага аўтара ўвайшоў у доўгі спіс. Наперадзе — спаборніцтва.

Дарэчы, лаўрэатамі прэміі «Ясная Поляна» ў мінулыя гады былі такія аўтарытэтныя расійскія празаікі, як Юрый Мамлееў, Ірына Мамаева, Наталля Ключарова, Дзмітрый Шэвараў, Міхаіл Таркоўскі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Фота БЕЛТА.

Каля 8 тыс. прызыўнікоў 16 чэрвеня прыняло прысягу ў злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл Беларусі. Толькі ў 72-м гвардзейскім аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў у Барысаве на вернасць Радзіме прысягнула каля 2 тыс. чалавек.

НА ЗДЫМКУ: Радавыя 103-й брыгады Віталь Кашынскі і Дзмітрый Грыб прымаюць віншаванне з прыняцем прысягі ад намесніка начальніка 307-й школы маёра Віталя Высоцкага.

ГАЛАГРАФІЧНЫ ВІЦЕБСК

Выстава галаграм аж з 14 краін свету (Беларусі, Аўстраліі, Вялікабрытаніі, Ізраіля, Ірана, Канады, Літвы і іншых краін) абяцае выклікаць фурор і ўразіць наведвальнікаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Цікава, што ў свеце існуе ўсяго каля дзесяці галаграфічных студый, адна з якіх знаходзіцца ў Беларусі. Гэты факт і дазволіў сабраць унікальную экспазіцыю.

Міжнародная выстава мастацкіх галаграм «Галаграфія-2012. Віцебск» будзе працаваць да другой паловы жніўня. На ёй прадставяць звыш пяцідзесяці мастацкіх галаграм. Увосень мінулага года выстава «Галаграфія-2011. Мінск» з велізарным поспехам прайшла ў беларускай сталіцы: за няпоўныя тры месяцы яе наведалі больш за 100 тысяч чалавек.

Мастацкая галаграфія — гэта мастацтва новага тысячагоддзя, творчасць на стыку жывапісу, псіхалогіі і фізікі. Яна выклікае вялікую цікавасць у свеце, з'яўляючыся найбольш эфектыўным спосабам адлюстравання аб'ёмных малюнкаў на плоскай паверхні. Апошняе знаходзіць усё большае прымяненне ў мастацтве, рэкламе, музейнай справе, дызайне і архітэктуры, картаграфіі, адукацыі і многіх іншых сферах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота БЕЛТА.

Удзельнікі семінара прадстаўнікоў органаў улады і СМІ 15 чэрвеня прайшлі на байдарках па Аўгустоўскім канале праз дзяржаўную мяжу Рэспубліка Беларусь — Рэспубліка Польшча (водны пагранпераход «Лясная — Рудаўка»). Практычны семінар для прадстаўнікоў мясцовых органаў улады і сродкаў масавай інфармацыі Беларусі і Польшчы праходзіць з 15 па 19 чэрвеня 2012 года на тэрыторыі Польшчы ў рамках рэалізацыі праекта «Камунікацыі без межаў — стварэнне трансгранічнай турысцка-інфармацыйнай сеткі».

НА ЗДЫМКУ: старшыня Слонімскага райвыканкама Іосіф Паўлюкевіч і іншыя ўдзельнікі семінара.

ВЫРАТАВАЛА ГАСПАДАРА

На пажары ў Пінскім раёне жанчына выратавала сужэнца. Мужчына атрымаў апёкі рук і твару.

Выклік у службу МНС паступіў каля 9 гадзін раніцы. Калі першыя падраздзяленні прыбылі на месца — на вуліцу Высокую ў вёсцы Таргошыцы — з драўлянага жылога дома ішоў дым, а гаспадары знаходзіліся на вуліцы. Жыллё, што выкарыстоўвалася пад дачу, належала 54-гадовай жанчыне. Да прыезду пажарных-выратавальнікаў яна выратавала свайго 56-гадовага сужэнца, інваліда першай групы па апорна-рухальным апараце. Мужчыну шпіталізавалі ў Пінскую гарадскую бальніцу з атручэннем прадуктамі гарэння, тэрмічнымі апёкамі рук і твару. У выніку пажару пашкоджана ўнутранае аздабленне дома і маёмасць. Прычыны здарэння высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота БЕЛТА.

Больш за 100 чалавек узялі ўдзел у турніры «Забег басаногі», які прайшоў у Браславе 16 чэрвеня.

АЎТАРЫТЭТНА

Станіслаў БУКО, начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта: «Пытанне на кантролі ў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта».

— Людзі, вядома, незадаволеныя, што побач з іх шматпавярховікамі ўзвядуць яшчэ два. І гэту іх незадаволенасць чыста па-чалавечы можна зразумець. Але не трэба кіравацца эмоцыямі, мы ж жывём у цывілізаваным грамадстве, таму і вырашыць гэтае пытанне павінны цывілізавана. Пытанне мэтазгоднасці будаўніцтва дамоў ва Уручы-2 знаходзіцца на кантролі ў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Уладзімір Макей даручыў зрабіць кампетэнтнае заключэнне спецыялістам з Міністэрства архітэктуры, РУП «Галоўдзяржбудэкспертыза» Дзяржстандарта, Мінгарвыканкама адносна адпаведнасці запланаванай будоўлі закону, падрыхтаваць свае прапановы. Трэба сумясціць усю інфармацыю, выслухаць пазіцыю кожнага і толькі пасля гэтага можна будзе прыняць канчатковае рашэнне.

Надзея ДРЫЛА.

КРЫШАЧКУ ГРЭЧАСКАГА ШЧАСЦЯ

У ПАРТЫЯ эліны і хітрыя чэхі, фіяска двух трэнераў галандцаў і вікторыя двух партугальцаў. Чэмпіянат Еўропы па футболе заўзята раздае квіткі ў чвэрцьфінал і не менш актыўна адпраўляе няўдачнікаў дадому.

Яшчэ напярэдадні Еўра-2012 расійскія журналісты і заўзятары прадказвалі выхад расіян у чвэрцьфінал кантынентальнага першынства. Аднак «настрадамусы» з іх атрымаліся нікчэмныя. Толькі ў лёсаванні фартуна сапраўды падыграла рускім. Польшча, Грэцыя, Чэхія — каманды цудоўныя, але не з шэрагу еўрапейскіх футбольных монстраў. Але словы разышліся з дзеяннямі, як мячы з варотамі. Варшава развіталася не толькі з футбалістамі, але з 20-тысячным «войскам» балельшчыкаў Расіі. Польскія прыбіральшчыцы ўздыхнуць з палёгкай, а вось прадаўцы засумуюць. Столькі піва яны, напэўна, даўно не прадавалі.

У заключным матчы групавога этапа расіянам хапіла б і нічыёй з грэкамі, падапечнымі партугальца Фернанду Сантуша. І на яе яны не нагулялі. Напрыканцы першай паловы Гіоргіяс Карагуніс моцным ударам перайграў Малафеева. 0:1 — лік, які так і не змяніўся на табло да канца матча.

— Гэта чараўніцтва, неверагодная ноч для ўсёй Грэцыі, — у радасных пачуццях прызнаўся Карагуніс. — Мы гулялі з вельмі добрай камандай, для перамогі над якой патрэбна было крышачку шчасця. І мы яго атрымалі.

— Расцэньваю паражэнне ад грэкаў як правал і ганьбу, — рэзка пракаментаваў фіяска зборнай Васіль Уткін, той самы футбольны каментатар. — Дзік Адвакат кіруе камандай з такой упэўненасцю, як дзесяцікласніца, якая ўпершыню сядае за руль «жыгулёў». Найперш гэта трэнерскі правал і трэнерская ганьба.

Акрамя грэкаў далей з квартэта А прайшлі чэхі, якія перайгралі палякаў (1:0). Адметна, што пасля разгромнага паражэння ад расіян многія спісалі Чэхію з прэтэндэнтаў у барацьбе за чвэрцьфінал. Акрамя футбалістаў, якія да апошняга змагаліся за перамогу.

Яшчэ адна зборная-расчараванне — Галандыя. Ар'ен Рабэн, Рафаэль ван дэр Варт, Робін ван Персі, Уэслі Снайдэр — сапраўдныя футбольныя перліны, мець якія не супраць любая каманда. Толькі гульні галандцаў зорны бляск імёнаў ачкоў не дадаў. Наадварот. Каманда не здолела прадэманстраваць цэласную, стабільную камандную гульню. Заключны групавы матч супраць партугальцаў не стаў выключэннем з галандскай традыцыі апошняга тыдня. У трэнерскай дуэлі Паўлу Бенту перайграў Берта ван Марвіка, і аранжавыя пакідаюць чэмпіянат — 2:1. Прычыны? Пасля гульні з пірэнейцамі Ар'ен Рабэн агучыў, што ўнутры каманды нешта адбылося, але гэта павінна застацца паміж гульцамі. Вось такая гісторыя, працяг якой яшчэ будзе.

Дарэчы, кампанію ў чвэрцьфінале партугальцам з групы В складуць немцы, якія перамаглі датчан з такім жа лікам — 2:1.

Тарас ШЧЫРЫ.

КОЛЬКАСЦЬ КЛЯШЧОЎ ДАСЯГНУЛА МАКСІМУМУ?

ПА звестках рэспубліканскай санэпідслужбы, з пачатку года ў Беларусі ад укусаў кляшчоў пацярпелі ўжо 9667 чалавек, у тым ліку 2805 дзяцей. Гэта ў 1,7 раза больш, чым за аналагічны перыяд 2011 года. Найбольшая колькасць ахвяр кляшчоў зарэгістравана ў Мінску (2479 чалавек), Віцебскай (1574 чалавекі) і Мінскай абласцях (1364 чалавекі). У большасці выпадкаў сталічныя жыхары станавіліся аб'ектам для нападу кляшчоў, калі знаходзіліся за межамі горада: у лесе або на дачным участку.

Паводле энтамалагічных назіранняў за прайшоўшы перыяд гэтага года колькасць кляшчоў у прыродных ачагах павялічылася ў 1,5 раза. Найбольшая іх колькасць была адзначана ў маі на тэрыторыі Гродзенскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей. За 4 месяцы 2012 года ў краіне ўжо зарэгістраваны 92 выпадкі хваробы Лайма і 2 выпадкі клешчавога энцэфаліту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕ ТОЛЬКІ «ПАМОЧНІЦА»

З-за парушэння правілаў эксплуатацыі электраабсталявання ў Светлагорску ледзь не загінула пенсіянерка. 74-гадовую жанчыну эвакуявалі з кватэры выратавальнікі. Пацярпелая з папярэднім дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» знаходзіцца ў бальніцы. У выніку здарэння пашкоджана пральная машына, маёмасць у ванным пакоі, сцены і столь у двухпакаёўцы. Мяркуецца, што прычынай пажару стала кароткае замыканне электраправодкі ў аўтаматычнай пральнай машыне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.